# ПАТРЫЯТЫЧНА-ВЫХАВАУЧЫ АСПЕКТ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

Болбас В. С.
*Акцябрская СШ № 3*

Адной з прычын складанасці праблем патрыятычнага выхавання моладзі, якая паўстала ў апошні час, з'яўляецца тое, што ў папярэдні перыяд такі працэс разгортваўся на даволі вузкім гістарычным падмурку. Карані, якія сілкавалі гэтую маральную якасць, заходзілі на глыбіню ўсяго некалькі дзесяцігоддзяў.

Таму адно з выйсцяў бачыцца ў выкарыстанні вопыту патрыятычнага выхавання нашых продкаў, што апроч ўсяго іншага будзе садзейнічаць абуджэнню патрыятычных пачуццяў, якія, як паказваюць гісторыка-педагагічныя даследаванні, заўсёды былі ўласцівы нашаму народу.

Адным з першапраходнікаў у тэарэтычнай распрацоўцы гэтага пытання быў вялікі наш пачынальнік Францыск Скарына. Ён быў цвёрда пераканаты, што адна з асноўных якасцей прыстойнага хрысціяніна — чалавекалюбства не можа быць сфармавана без любві да свайго народа, сваёй Радзімы. Даследчыкі сцвярджаюць, што само паняцце «Айчына», як філасофская катэгорыя, была менавіта першадрукаром уведзена ў грамадскую думку Беларусі.

Вытокі любві да Радзімы ім выражаны ў радках, якія сёння ўжо сталі хрэстаматыйнымі, у якіх Ф. Скарына вобразна і пераканаўча паказвае, чаму да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваліся людзі «великую ласку имають». Паслядоўны мараліст, папулярызатар асноўных хрысціянскіх і агульначалавечых якасцей, ён у той жа час лічыў узорам гераізму ўчынак гераіні аднайменнай біблейскай аповесці «Юдзіф», якая дзеля выратавання роднага горада ад чужаземных захопнікаў ахвяравала сваім жаночым гонарам і пераступіла межы існаваўшых уяўленняў аб прыстойнасці падобных учынкаў.

Прынята лічыць, што беларускаму народу спрадвеку ўласцівы такія якасці, як талерантнасць, нязлаблівасць, пакорлівасць, цярплівасць і ім падобныя. Адным з першых, хто засяродзіў увагу і на іншых якасцях беларусаў, быў М. Гусоўскі. Ён пераканаўча паказаў, што нашы прашчуры былі дужымі, храбрымі, спрактыкаванымі воінамі. А ў выпадку, калі іх аб'ядноўваў такі вопытны ваявода, як князь Вітаўт, то ім «не было роўных ва ўсім свеце». У паэме «Перамога над туркамі» паэт пераконвае, што сіла духу нашых людзей, якую ён, дарэчы, ставіў наперадзе сілы цела, дапамагла атрымаць бліскучую перамогу над захопнікамі.

Вельмі дэталёва распрацоўваў праблему — ці можа сапраўдны хрысціянін браць у рукі зброю — вядомы мысліцель і гуманіст Сымон Будны. Ён прыходзіў да высновы, што калі размова ідзе аб справядлівых войнах, то кожны сумленны грамадзянін павінен там браць самы актыўны ўдзел.

Паплечнік С. Буднага, рэктар вядомай у той час Іўеўскай школы Я. Намыслоўскі, які спецыяльна для сваіх вучняў выдаў вучэбны дапаможнік па этыцы, павучаў, што кожны, хто сумленны, павінен гарэць такой любоўю да Радзімы, што дзеля яе шчасця ў любую хвіліну можа ахвяраваць нават сваім жыццём.

Сапраўдным сцяганосцам нацыянальнага патрыятызму лічыцца Васіль Цяпінскі, які катэгарычна заяўляў, што не можа ўявіць сябе па-за межамі Айчыны, таму просіць Бога ў выпадку пагібелі Радзімы даць і яму магчымасць разам з ей загінуць. У аснове выхавання патрыятызму, на яго думку, павінна ляжаць прывіццё любві да духоўнай спадчыны народа — мовы, культуры.

Даволі значную колькасць патрыятычна-выхаваўчага матэрыялу ўтрымлівае і народна-педагагічная скарбонка нашых продкаў. У канву вусна-паэтычнай творчасці беларусаў пакладзены замілаванне родным краем, любоў да яго людзей. У

народзе лічылі, што Айчыну сапраўдны чалавек не мяняе ні на якія багацці. Патрыятычныя пачуцці прысутнічаюць у кожнага народа, але мабыць ні ў каго, як ва ўсходніх славян, іх выхаванню не ўдзяляецца такое важнае месца.

Характэрна, што патрыятычна-выхаваўчыя накірункі у педагагічнай думцы беларускага народа не дапускалі нацыянальнай фанабэрыі, пыхлівасці, знявагі да іншых народаў. Нашы мысліўцы падкрэслівалі, што беларускі народ — гэта толькі частка славянскай супольнасці. Нават прадстаўнікі зусім іншых веравызнанняў не выклікалі ў нашых супляменнікаў ніякіх антыпатый. М. Гусоўскі ўзрушана пісаў, што той, каму вера загадвае ненавідзець іншых, наўрад ці заслугоўвае Боскай ласкі.

Яшчэ адной, не менш важнай асаблівасцю патрыятычна-выхаваўчага аспекту педагагічнай думкі Беларусі эпохі Адраджэння быў яго ярка выражаны дэмакратычны ўхіл. У адрозненне ад феадальна-рыцарскіх уяўленняў аб патрыятызме заходнееўрапейцаў, як аб якасці лёсам выбраных асоб, айчынныя мысліўцы распаўсюджвалі яе і на простых людзей. Слынныя асветнікі заўсёды падкрэслівалі, што гонар і слава не могуць быць перададзены ў спадчыну, а павінны здабывацца кожным чалавекам незалежна ад паходжання.

Выхаваўчыя падыходы ў айчыннай педагагічнай думцы вызначаліся яшчэ і тым, што мелі сацыяльна-завостраны, практычна арыентаваны накірунак. Патрыятызм не ўяўляў сабой нейкую абстрактную катэгорыю. Любоў да Айчыны — гэта не проста ўзвышанае пачуццё, а рэальнае служэнне свайму народу. Вось чаму Ф. Скарына заклікае не шкадаваць нічога дзеля росквіту свайго краю. Сваёй практычнай дзейнасцю ў гэтым напрамку ён даваў добры прыклад іншым. В. Цяплінскі таксама заяўляў, што хоча быць практычна свайму народу «услугуючим».

М. Гусоўскі падводзіў да высновы, што ў рэшце рэшт глыбіня патрыятычных пачуццяў правяраецца на ратным полі. Ён яскрава паказвае, якія намаганні ў фізічна-валявой і маральнай падрыхтоўцы павінны быць прыкладзены кожным чалавекам, каб у неабходны час быць родным абаронцам Айчыны.

Такім чынам з прагматычнай скіраванасці патрыятызму выцякала яшчэ адна яго асаблівасць, якая заключалася ў тым, што падкрэслівалася неабходнасць валодання гэтай якасцю не толькі ў часы ліхалецця, але і ў паўсядзённым жыцці. У сувязі з рэальнай пагрозай апалячвання народа востра ставілася пытанне аб фарміраванні гэтай якасці на глыбокіх нацыянальных пачатках.



Нават сціплы экскурс у гісторыю педагагічнай думкі Беларусі паказвае, што патрыятычныя пачуцці, жаданне служыць Радзіме складаюць адзін з важнейшых кампанентаў менталітэту беларускага народа. А гэта дае ўсе падставы сцвярджаць аб тым, што і ў наш час прадуманая сістэма патрыятычнай выхаваўчай работы абавязкова прынясе добры плён. І адной з важнейшых умоў жыццядзейнасці такой сістэмы павінна быць пабудова яе на глыбокім нацыянальным падмурку з выкарыстаннем адпаведнага матэрыялу ўсіх эпох ў перыядаў гісторыі нашага народа, нашай Бацькаўшчыны.